А. М. НАРОЎСКАЯ

# ГІСТАРЫЧНЫ ПАРТРЭТ У МАСТАЦКАЙ КАЛЕКЦЫІ ВІЛЕНСКАГА МУЗЕЯ СТАРАЖЫТНАСЦЕЙ / ISTORINIS PORTRETAS Į MENO KOLEKCIJA VILNIAUS MUZEJUS SENIENŲ

A. NAROUSKAYA

# THE HISTORICAL PORTRAIT IN THE ART COLLECTION OF THE MUSEUM OF ANTIQUITIES IN VILNIUS

*The article discusses the unique art collection of historical portraits of the Vilna Museum of Antiquities. A list of portraits: Polish kings and Grand Dukes of Lithuania, Russian emperors, distinguished generals, scientists, writers and artists. Attention is paid to the portrait gallery of families of Radziwill, Tyszkiewicz, Khraptovich, Khatkevich, Sapieha, etc. Attribute data is analyzed.*

Партрэтныя галерэі ў XVIII–XIX стст. упрыгожвалі палацы ўсіх вядомых магнацкіх родаў Беларусі, у тым ліку Радзівілаў, Сапегаў, Пацаў, Агіньскіх, Тышкевічаў і інш. У свецкім жывапісе вядучае месца займалі парадныя, рыцарскі, прадстаўнічы (прадстаўнік роду), пахавальны партрэты.

У 1842 г. браты Канстанцін і Яўстах Тышкевічы заснавалі ў сваім лагойскім маёнтку першы музей у Беларусі. Значнае месца ў лагойскім музеі займалі таксама партрэты прадстаўнікоў 500-гадовага (12 пакаленняў) лагойскага роду Тышкевічаў. Большасць партрэтаў XVIII–XIX стст., аднак былі і ранейшага часу – XVI–XVII стст. Амаль усе партрэты – у натуральную велічыню, па пояс альбо на ўвесь рост (партрэт Пія – бацькі Канстанціна і Яўстаха Тышкевічаў; партрэт рэферэнта Вялікага Княства Літоўскага Вікенція Тышкевіча, біскупа Антонія Тышкевіча і інш.).

Музей меў у сваіх экспазіцыях аўтапартрэты Яна Рустэма і Яна Дамеля і іншых тагачасных дзеячаў культуры Беларусі і Літвы. У 1850 г. Рафал Слізень выканаў бронзавы медальён з партрэтам Яўстаха Тышкевіча.

На грунце лагойскага збору Тышкевічы заснавалі Музей старажытнасцей у Вільні. У 1856 г. Віленская археалагічная камісія звярнулася да ўсіх зацікаўленых асоб рабіць ахвяраванні для Музея старажытнасцей. У «Записках Виленской археологической комиссии» за 1856 г. адзначаецца, што за 5 месяцаў, з 1 студзеня па 11 чэрвеня, ахвяраванні зрабілі 102 чалавекі, сярод падарункаў было шмат партрэтаў гістарычных дзеячаў і асоб (табл. 1).

Табліца 1

**Спіс гістарычных партрэтаў,**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ахвяраваных Віленскаму музею старажытнасцей**
(з 1 студзеня па 11 чэрвеня 1856 г.) [3, с. 51–57]*

| № п/п | Прозвішчы ахвяравальнікаў | Назвы мастацкіх твораў (партрэты) |
|---|---|---|
| 1 | Ксендз Банковский | Портрет гетмана Ивана Клементия Браницкого |
| 2 | Буржинский Анзельм | Портреты: королевы Цецилии Ренаты, летописца Длугоша, Дмитрия Самозванца, Карла XII, папы Пия VI и некоторых замечательных драматических артистов |
| 3 | Велькъ Александр | Старинный литографированный портрет митрополита Игнатия Поцея |
| 5 | Гербурт Прелат | Портреты некоторых пап |
| 7 | Каминский Мстислав | Портрет профессора Жуковского и вид ратуши в Вильно |
| 8 | Киркор Адам | Портрет в. кн. Витовта (во весь рост), сделанный масляными красками Зенкевичем |
| 9 | Малиновский Николай | Портреты императора Александра I работы Пешки и Матвея Догеля |
| 10 | Ксендз Малышевич | Портреты князя Нестора Сапеги, генерал от артиллерии, и французских консулов |
| 12 | Ромер Эдуард | Портрет каноника Дауского |
| 13 | Ходзько Игнатий | Портрет кн. Войцеха Радзивилла масляными красками. Рисунок Смуглевича, изображающий кончину Стефана Чарнецкого, и 39 портретов пап |

У каталогу прыводзіцца спіс партрэтаў з указаннем прозвішчаў гістарычных дзеячаў і асоб, атрыбуцыйныя звесткі даюцца мінімальныя. У трох выпадках указана прозвішча мастака, які напісаў твор: партрэт князя Вітаўта (Я. Зянкевіч), партрэт імператара Аляксандра I (мастак Ю. Пешка) і малюнак канчыны Стэфана Чарнецкага (мастак Ф. Смуглевіч). Аналіз каталога паказаў, што сярод партрэтаў – адна літаграфія, дзве карціны напісаны алеем і адна партрэт-малюнак. Партрэт князя Вітаўта выкананы ў поўны рост.

Гістарычныя партрэты, паступаўшыя ў Віленскі музей старажытнасцей, заносілі ў кнігу першаснай рэгістрацыі фондаў, дзе запісваліся толькі асноўныя звесткі аб іх. Яны сістэматызаваліся паводле калекцыйнага прынцыпу, што адпавядала апошнім дасягненням экспазіцый музеяў тагачаснай Еўропы.

* Тут і далей у табліцах тэкст прыведзены адпаведна мове і арфаграфіі крыніцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У каталогу прадметаў Музея старажытнасцей пры Віленскай публічнай бібліятэцы за 1885 г. адзначаецца, што на канец 1858 г. у зборы музея налічвалася каля 3 тыс. адзінак захавання [4]. Мелася выдатная галерэя алейных партрэтаў вялікіх князёў літоўскіх, каралёў польскіх і імператараў расійскіх, выдатных военачальнікаў і розных саноўнікаў, навукоўцаў, літаратараў і артыстаў.

Сярод экспануемых матэрыялаў былі і партрэты прадстаўнікоў родаў Радзівілаў, Тышкевічаў, Храптовічаў, Хадкевічаў, Сапегаў і інш. Мастацкая калекцыя пастаянна папаўнялася за кошт ахвяраванняў. Па звестках Г. А. Каханоўскага, у першыя два гады ў каталогу было зарэгістравана 10 тыс. музейных прадметаў [6, с. 33]. У музеі экспанаваліся партрэты такіх гістарычных асоб, як Стэфана Баторыя, Тадэвуша Касцюшкі, Адама Міцкевіча, якія выкарыстоўваліся для прапаганды патрыятычных ідэй.

Віленскі музей старажытнасцей набываў папулярнасць, аб чым сведчыць колькасць наведвальнікаў. Так, у першыя два месяцы музей прыняў каля 3,5 тыс. чалавек, а ўсяго за 1856 г. – 7150 жыхароў Вільні і гасцей горада [2, с. 81].

Пасля падаўлення паўстання пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага 1863–1864 гг. пачаўся перыяд царскага тэрору. У музеі ўлады бачылі асяродак небяспечнага вальнадумства. Па распараджэнні віленскага генерал-губернатара М. М. Мураўёва музей быў зачынены і падвергся «рэвізіі». У 1865 г. была створана асобая камісія, якая выдзеліла з музейных прадметаў тыя, якія мелі навукова-гістарычнае значэнне. У выніку з музея былі вывезены найбольш значныя для беларускай гісторыі музейныя прадметы. Па даных гістарычнага часопіса «Вестник Западной России», у Маскву было вывезена 39 скрынак музейных прадметаў [1, с. 202].

Сярод 256 гісторыка-мастацкіх прадметаў, якія «...нагадвалі польскае ўладанне ў краі і штучна падтрымлівалі ў насельніцтва дарэмныя надзеі і нядобрыя памкненні», было больш за 100 твораў мастацтва, у тым ліку гістарычныя партрэты, якія адправілі ў Маскоўскі публічны і Румянцаўскі музей, дзе карціны не толькі не выставілі, але нават практычна не апісалі. Сярод іх аўтапартрэт Яна Рустэма, 56 партрэтаў-эстампаў польскіх каралёў, 160 партрэтаў прыватных асоб [1, с. 204–213].

Шмат прадметаў са сваіх збораў Канстанцін Тышкевіч перадаў у 1864–1868 гг. названаму музею ў Маскве. Сярод 350 перададзеных карцін былі два партрэты XVII ст. – шляхцянкі, «уладальніцы фальварка Разанстадзіна [каля Гродна] Еверазіны» (Еўфрасінні)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тышкевіч і ваяводы мсціслаўскага, пазней трокскага і нарэшце віленскага Януша Тышкевіча (1570–1648).

Значная частка музейных прадметаў Віленскага музея захоўваецца цяпер у Нацыянальным музеі Літвы. У тым жа Львове ў Дзяржаўным гістарычным музеі захоўваецца малюнак мастака У. Валькевіча – партрэт Яўстаха Тышкевіча.

Табліца 2

**Спіс гістарычных партрэтаў, вывезеных у Маскоўскі публічны і Румянцаўскі музей**

| | |
|---|---|
| 1 | Сигизмунд 1-й – изразец с изображением его в короне и со скипетром в руке |
| 2 | Август III, металлический медальон, масляными красками |
| 3 | Иван Непомув – живописное изображение его на медном медальоне |
| 4 | Сырокомля, портрет |
| 5 | Стефан Баторий, большой портрет масляными красками |
| 6 | Сапега, портрет |
| 7 | Станислав Август, изображение его на коне масляными красками |
| 8 | Портрет Януша Тышкевича |
| 9 | Портрет гетмана Тышкевича |
| 10 | Портрет епископа Тышкевича |
| 11 | Хрептович, портрет Литавора Хрептовича, канцлера Великого Княжества Литовского (прозвание «Litauer», по объяснению графа Тышкевича, дано ему вследствие того, что православные предки его отстаивали на сеймах литовские дела) |
| 12 | Портрет Валицкого |
| 13 | Булгак, последний униатский митрополит, портрет |
| 14 | Богдан Хмельницкий, портрет |
| 15 | Август II, портрет масляными красками |
| 16 | Станислав Лещинский, портрет масляными красками |
| 17 | Альберт Войцех Радзивилл, современный портрет |
| 18 | Гюбель, профессор |
| 19 | Флеминг, подскарбий Великого Княжества Литовского времен Августа III |
| 20 | Тышкевич Ян, портрет |
| 21 | Сапега, портрет |
| 22 | Вишневецкий, портрет |
| 23 | Радзиевский Иван, виленский костелян |
| 24 | Ходкевич, портрет масляными красками |
| 25 | Вольский Николай, витебский костелян, основатель монастыря в Кременце |
| 26 | Марина Мнишек, портрет масляными красками |
| 27 | Радзивилл, Пане Коханку, предводитель Барской конфедерации в |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | 1790 г., портрет |
| 28 | Браницкий Иван Клементий, великий гетман Княжества Литовского, портрет |
| 29 | Огинский, портрет |
| 30 | Кантембрин, духовник Радзивиллов, портрет |
| 31 | Тышкевич Евфросиния, портрет |
| 32 | Букатый Франц, посол Станислава Августа |
| 33 | Дашела, польский живописец, сосланный в Сибирь за подделывание фальшивых ассигнаций |
| 34 | Чарнецкий, портрет |
| 35 | Зноско, портрет |
| 36 | Ян Собесский, портрет жены его, Марии Казимиры |
| 37 | Почобут, иезуит, основатель Виленской обсерватории |
| 38 | Пинабель, профессор |
| 39 | Княгиня Радзивилл, писательница, портрет |
| 40 | Мадонна, живописное изображение на медном медальоне |
| 41 | Барбара Радзивилл, портрет масляными красками |
| 42 | Кулаковский, директор Белостокской гимназии |
| 43 | Тизенгауз Антоний, подскарбий Великого Княжества Литовского, портрет |
| 44 | Тышкевич, маршал, портрет |
| 45 | Мократский, художник, портрет |
| 46 | Догель Пиар, учредитель Виленского конвикта, портрет |
| 47 | Понятовский, примас, портрет |
| 48 | Коссаковский, участник Барской конфедерации в Вильне 1794 года |
| 49 | Гедройц, примас, архидиакон, портрет |
| 50 | Станислав Август, портрет |
| 51 | Генрих Валезиус (Valois), портрет масляными красками |
| 52 | Ленчицкий, иезуит, портрет |
| 53 | Владислав III, портрет масляными красками |
| 54 | Чарторыжский, портрет |
| 55 | Мицкевич, портрет |
| 56 | Радзивилл, князь Матвей. Виленский кастелян, поясной портрет масляными красками |
| 57 | Владислав IV, портрет масляными красками |
| 58 | Володкович, соврем. Карла Радзивилла, портрет |
| 59 | Монах Кардецкий, портрет |
| 60 | Мицкевич, поэт, портрет |
| 61 | Екатерина Ягеллонка, портрет ее матери |
| 62 | Сигизмунд старший, портрет масляными красками |
| 63 | Портрет Малаховского |
| 64 | Радзивилл Николай, портрет |
| 65 | Богуш, виленский прелат, портрет |
| 66 | Занончек, генерал, портрет |
| 67 | Казимир Сапега |
| 68 | Костельный дед, портрет |
| 69 | Сигизмунд III, изображение на янтаре, им самим сделанное |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| 70 | Папа Григорий, живописное изображение на медном медальоне |

Атрыбуцыйныя даныя ў каталогу мінімальныя. Прыводзяцца звесткі аб тым, што 13 партрэтаў напісаны алейнымі фарбамі, тры партрэты выкананы на медных медальёнах, адзін партрэт напісаны на метале, партрэт Жыгімонта I – на кафлі. Большасць партрэтаў (42 адзінкі) мае толькі надпіс «партрэт» з указаннем прозвішча і не мае іншых атрыбуцыйных звестак, хутчэй за ўсё яны выкананы алейнымі фарбамі. У спісе каталога не ўказаны прозвішчы мастакоў, аўтараў партрэтаў.

Некалькі партрэтаў маюць больш падрабязнае апісанне, напрыклад: «..Сигизмунд 1-й – изразец с изображением его в короне и со скипетром в руке», «Станислав Август, изображение его на коне». Ёсць некаторыя звесткі аб памерах і выяве партрэтуемага: «Стефан Баторий, большой портрет...», «Радзивилл, князь Матвей. Виленский кастелян, поясной портрет...» альбо: «Дашела, польский живописец, сосланный в Сибирь за подделывание фальшивых ассигнаций».

Шэраг партрэтаў утрымлівае звесткі аб пасадах, якія займалі асобы, увасобленыя ў партрэтах. Напрыклад: «…портрет Литавора Хрептовича, канцлера Великого Княжества Литовского»; «Булгак, последний униатский митрополит»; «Радзиевский Иван, виленский кастелян»; «Вольский Николай, витебский костелян, основатель монастыря в Кременце»; «Радзивилл, Пане Коханку, предводитель Барской конфедерации в 1790 г.»; «Браницкий Иван Клементий, великий гетман Княжества Литовского»; «Кантембрин, духовник Радзивиллов»; «Букатый Франц, посол Станислава Августа»; «Почобут, иезуит, основатель Виленской обсерватории».

У некаторых выпадках у каталогу прыводзяцца цікавыя звесткі аб дзеячах, якія прадстаўлены на партрэце. Напрыклад: «портрет Литавора Хрептовича, канцлера Великого Княжества Литовского (прозвание «Litauer», по объяснению графа Тышкевича, дано ему вследствие того, что православные предки его отстаивали на сеймах литовские дела»).

Такім чынам, большая частка гістарычных партрэтаў была адпраўлена ў Маскву і разышлася па іншых зборах, астатнія прадметы перанесены на верхні паверх і рассартаваны ў новым парадку. Па малюнках мастака Грынёва ў 1872 г. была выраблена новая мэбля, на якой размясціліся музейныя экспанаты.

У адпаведнасці з каталогам прадметаў музея старажытнасцей пры Віленскай публічнай бібліятэцы за 1885 г. у «Отд. М»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

надрукаваны пералік мастацкай калекцыі, якая засталася пасля ўсіх рэвізій. У раздзеле каталога «Живопись» прадстаўлены асобна «Портреты» (см. табл. 3) [4, с. 266–270].

Табліца 3

| | Отд. М |
|---|---|
| | XII. Художественный отдел |
| | А. Живопись |
| № п/п | 1. ПОРТРЕТЫ |
| 1 | Его Императорское Величество Государь Император Александр Александрович, в бытность его наследником престола |
| 2 | Его Высочество покойный Наследник Цесаревич Николай Александрович |
| 3 | Император Николай I |
| 4 | Императрица Екатерина II |
| 5 | Преосвященный Филарет, бывший митрополит Московский |
| 6 | Преосвященный Филарет, бывший митрополит Киевский |
| 7 | Преосвященный Никанор, бывший митрополит С.-Петербургский |
| 8 | Преосвященный Иосиф Семашко, бывший митрополит Литовский |
| 9 | Преосвященный Иосиф Семашко, до присоединения своего к православию |
| 10 | Преосвященный Георгий Конисский, бывший архиепископ Белорусский |
| 11 | Преосвященный Антоний Зубко, бывший епископ Минский |
| 12 | Преосвященный Игнатий Железовский, бывший епископ Брестский |
| 13 | Бывший генерал-губернатор Северо-Западного края граф Баранов |
| 14 | Бывший генерал-губернатор Северо-Западного края граф М. Н. Муравьев |
| 15 | Граф Н.А.Протасов, бывший обер-прокурор Св. Синода. |
| 16 | Граф Блудов, известный деятель по освобождению крестьян от крепостной зависимости |
| 17 | Скрипицин, бывший в 1839 г. директором департамента иностранных исповеданий |
| 18 | Бывший министр народного просвещения граф Д. А. Толстой |
| 19 | Бывший попечитель Виленского учебного округа И. И. Корнилов |
| 20 | Господин попечитель Виленского учебного округа Н. А. Сергиевский |
| 21 | Портрет неизвестного |
| 22 | Портрет неизвестного |
| 23 | Портрет неизвестного; писан на дереве |

Некалькі партрэтаў прыводзяцца ў раздзеле «Л» [4, с. 265]:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Табліца 4

| № п/п | № у каталогу | Прадметы, якія паступілі ў музей з былой Віленскай абсерваторыі |
|---|---|---|
| 1 | 507 | Портрет императора Александра I |
| 2 | 508 | Портрет императора Николая I |
| 3 | 509 | Портрет императора Александра II |
| 4 | 512–520 | Девять портретов разных лиц, имевших отношение к Виленской обсерватории |

З прыведзеных звестак відаць: мастацкая калекцыя Віленскага музея старажытнасцей уяўляла ўнікальны збор гістарычных партрэтаў, аўтапартрэтаў вядомых беларускіх мастакоў, партрэтаў-эстампаў, партрэтаў прыватных асоб. У каталогу музея за 1885 г. прыводзіцца пералік той нязначнай часткі прадметаў мастацтва, якая засталася пасля ўсіх так званых рэвізій. Сярод гэтых работ партрэты імператараў, дзеячаў Расійскай імперыі і вышэйшых чыноў праваслаўнага духавенства. Але так сталася, што большая частка мастацкіх твораў разышлася па музеях іншых краін і прыватных калекцыях.


*1.* Вестник Западной России: ист.-лит. журнал. – Вильна, 1868. – Кн. 8, т. 3. – 252 с.

*2. Гужалоўскі А. А.* Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2001. – 124 с.

*3.* Записки Виленской археологической комиссии / под ред. А. Киркора, М. Гусева. – Вильна : тип. Завадского, 1856. – Ч. 1. – 59 с.

*4.* Каталог предметов музея древностей, состоящего при Виленской публичной библиотеке. – 2-е изд. – Вильна, 1885. – 272 с.

*5.* Каталог предметов музея древностей, состоящего при Виленской публичной библиотеке: доп. первое. – Вильна, 1898. – 154 с.

*6. Каханоўскі, Г. А.* Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч / Г. А. Каханоўскі, А. Г. Каханоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 63 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ